# § 32–33. Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця цывілізацый свету ў XVI–XVIII стст.

ІМПЕРЫЯ
ВАЙНА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ЗША
ТРЫЦЦАЦІГАДОВАЯ ВАЙНА
МАНАРХІЯ РЭСПУБЛІКА
АНГЛІЙСКАЯ БУРЖУАЗНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ФРАНЦУЗСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
СЯМІГАДОВАЯ ВАЙНА САМАІЗАЛЯЦЫЯ
ВАЙНА ЗА ІСПАНСКУЮ СПАДЧЫНУ

**1. Фарміраванне абсалютызму ў заходнееўрапейскіх дзяржавах і Расіі.** У перыяд ранняга Новага часу (XVI–XVIII стст.) у Еўропе адбыліся сур'ёзныя палітычныя змены, узніклі новыя формы кіравання грамадствам. Сярэдневяковую феадальную дзяржаву змяніла больш цэнтралізаваная і бюракратычная мадэль праўлення. Важным фактарам перамен былі каланіяльныя заваёвы еўрапейцаў у Азіі і Амерыцы.

Новы час — новыя імперыі

Першай адметнай з'явай гэтага перыяду было фарміраванне вялікіх імперый і дзяржаў. Вы ўжо ведаеце, што ў XVI–XVIII стст. у выніку каланіяльнай экспансіі ўтварыліся Іспанская, Партугальская, Брытанская, Французская каланіяльныя імперыі. З усіх дзяржаў, што калі-небудзь існавалі, Брытанская каланіяльная імперыя валодала найбольшай колькасцю тэрыторый на ўсіх пяці населеных кантынентах.

Назавіце вядомыя вам імперыі Старажытнага свету і Сярэднявечча.

Другой важнай асаблівасцю ранняга Новага часу было ўсталяванне ў заходнееўрапейскіх краінах і Расіі **абсалютнай (неабмежаванай) манархіі**, якая прыйшла на змену саслоўна-прадстаўнічай манархіі.

**Абсалютызм** — форма праўлення, пры якой манарху належыць неабмежаваная ўлада.

Успомніце, што такое саслоўна-прадстаўнічая манархія і калі яна сфарміравалася ў Еўропе.

Кантроль над вялікімі тэрыторыямі патрабаваў не толькі моцнай рукі манарха, але і значнай колькасці верных яму дзяржаўных служачых, адказных за выкананне рашэнняў. У сувязі з гэтым паралельна з канцэнтрацыяй усёй паўнаты ўлады ў руках адной манархічнай асобы фарміравалася *бюракратычная праслойка грамадства*. У Заходняй Еўропе XVII–XVIII стст. абсалютызм зрабіўся асноўнай формай праўлення.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Пытанне пра ўзнікненне абсалютызму як разнавіднасці манархічнай формы праўлення зусім не такое простае, як можа здацца на першы погляд. У гістарычнай навуцы існуюць розныя пункты погляду.

| Савецкая гістарычная навука | Сучасная гістарычная навука |
|---|---|
| Узмацненне манархіі тлумачылася абвастрэннем класавай (саслоўнай) барацьбы:<br>• сялянства і дваранства на зыходзе Позняга сярэднявечча;<br>• дваранства і буржуазіі ў Новым часе.<br>Прычым менавіта дваранства як прывілеяванае саслоўе было зацікаўлена ў моцнай цэнтралізаванай уладзе манарха. | Узнікненню абсалютызму паспрыялі фактары эканамічнага, сацыяльнага і культурнага характару:<br>• частыя войны, што патрабавалі грошай, адпаведна рост падаткаў;<br>• развіццё гандлю і неабходнасць пратэкцыяністкай палітыкі, якую паспяхова магла праводзіць толькі моцная дзяржава;<br>• вера простых людзей, найперш гарадскіх жыхароў і сялян, у моцнага кіраўніка, здольнага ўтаймаваць самавольства феадальнай вярхушкі. |
| *1. Чаму ў абодвух супрацьстаяннях менавіта дваранскае саслоўе падтрымала абсалютную ўладу манарха?* | *2. Якія з фактараў, на вашу думку, з'яўляюцца аб'ектыўнымі, а якія — суб'ектыўнымі?* |

*3. Які з двух пунктаў погляду здаецца вам больш аргументаваным? Ці можна казаць, што яны пярэчаць або дапаўняюць адно аднаго?*

«Дзяржава – гэта я»

## ЖЫЦЦЁ ЛЮДОВІКА XIV У ГРАВЮРАХ МАСТАКА М. ЛЕЛУАРА



Абсалютызм як форма праўлення дасягнуў апагею ў Францыі пры Людовіку XIV, які кіраваў у адпаведнасці са сваім славутым дэвізам: «Дзяржава — гэта я!». Асноўны прынцып абсалютнай манархіі заключаецца ў тым, што манарх з'яўляецца адзінай і канчатковай крыніцай улады, не падпарадкоўваецца ніякім законам, апроч боскага.

У Расіі абсалютная манархія ўсталявалася ў часы праўлення Пятра I, які імкнуўся наблізіць краіну да еўрапейскіх стандартаў. Ён правёў шэраг пераўтварэнняў, накіраваных на ўмацаванне цэнтралізаванай улады і бюракратыі, унёс змены ў арганізацыю эканомікі, вайсковай справы і арміі, навукі і культуры, што паспрыяла паступальнаму развіццю Расіі.

**2. Асаблівасці ваенных канфліктаў у Новы час.** Вайна як сацыяльная з'ява выступае неад'емнай уласцівасцю развіцця чалавечага грамадства. Яна спароджана ім і існуе на працягу ўсёй яго гісторыі, набывае новыя формы, маштабы і сродкі разам з паступальным

Вайна — жорсткі спадарожнік чалавецтва

развіццём грамадства, яго вытворчых сіл. Антыгуманная сутнасць і разбуральныя наступствы войнаў відавочныя, тым не менш яны па-ранейшаму з'яўляюцца адным са сродкаў вырашэння канфліктаў паміж краінамі і народамі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Сучасным бестселерам зрабілася кніга канадскага вучонага С. Пінкера «Найлепшае ў нас. Чаму гвалту ў свеце паменшала». Аўтар спецыялізуецца на эвалюцыйнай псіхалогіі, якая вывучае спецыфічныя псіхалагічныя асаблівасці чалавека як прадстаўніка віду *Homo sapiens*. У сваёй кнізе вучоны прапануе гіпотэзу, што самым крывавым стагоддзем у гісторыі чалавецтва было не XX ст., як можа здацца на першы погляд сучаснаму чалавеку (вядома, дзве сусветныя вайны і мноства лакальных канфліктаў прынеслі страшныя пакуты і велізарныя людскія страты), а ўсё ж стагоддзе XVII. У доказ Пінкер прыводзіць статыстыку: Трыццацігадовая вайна адабрала траціну насельніцтва Германіі, у гады Англійскай рэвалюцыі жорсткасць дзеянняў абодвух бакоў была нечуваная раней, падзенне дынастыі Мін суправаджалася ахвярамі ў 25 млн чалавек. Пры гэтым аўтар улічвае не агульную колькасць ахвяр, а іх суадносіны з агульнай колькасцю насельніцтва. Важным фактарам вучоны таксама лічыць само стаўленне чалавецтва да гвалту, якое з цягам гісторыі рабілася ўсё менш цярпімым. Гэтая пазіцыя, уласна, і адбілася ў назве кнігі.

1. *Назавіце гістарычныя факты, якія абумовілі шматлікія чалавечыя ахвяры ў XVI–XVIII стст.*
2. *Як вы ацэньваеце аргументы вучонага наконт таго, што «гвалту ў свеце зрабілася менш»? Якія аргументы могуць прыводзіць крытыкі яго тэорыі?*
3. *С. Пінкер называе 4 матывы («найлепшых анёлаў»), якія вымушаюць людзей адмовіцца ад гвалту на карысць супрацоўніцтва і альтруізму: эмпатыя, самакантроль, мараль і... Даведайцеся імя чацвёртага «анёла» і падыскутуйце, як яны працуюць у сукупнасці ў кожным з нас і грамадстве ў цэлым.*
4. *Якія, на вашу думку, умовы прадухілення войнаў у сучасным свеце?*

### Новы тып камплектавання армій

Цяжка палічыць усе вядомыя войны, што скаланалі Еўропу ў Сярэднія вякі і ў пачатку Новага часу. Многія з іх наогул не згаданы ў аналах гісто-

рыі. Гэта тлумачыцца тым, што ў эпоху Сярэднявечча вайна закранала ў асноўным інтарэсы толькі яе непасрэдных удзельнікаў. Адзін феадал нападаў на другога, збіраючы сваіх васалаў і абапіраючыся на наёмнікаў. Той, хто абараняўся, дзейнічаў такім самым чынам. Іх падданыя маглі і не ведаць пра пачатак вайны, калі жылі не на шляху руху войскаў. Такімі войны былі часткова і ў XVII ст. Напрыклад, у перыяд Трыццацігадовай вайны ўсё яшчэ існавалі наёмныя арміі, незалежныя ад дзяржавы. Рэсурсы ўсёй краіны, а таксама людскія рэсурсы вельмі рэдка мабілізоўваліся дзеля дасягнення перамогі ў вайне. Ваявалі адны супраць другіх феадалы і кіраўнікі дзяржаў, і надзвычай рэдка — дзяржавы. Рэсурсы ўсяго грамадства выкарыстоўвалі ў выключных выпадках, як правіла, у вызваленчых войнах — напрыклад, у вайне Нідэрландаў супраць Іспаніі ў XVI ст.

У XVI–XVII стст. у Заходняй Еўропе пачаўся пераход ад наёмніцтва да сталых нацыянальных армій. У наступным стагоддзі гэты працэс завяршыўся. Армію камплектавалі на аснове добраахвотнага або прымусовага набору і ператваралі ў адзін з элементаў усяго дзяржаўнага механізму. Яна была неадчувальная да асобных паражэнняў, бо «падсілкоўвалася» людскімі рэсурсамі ўсяго насельніцтва. У гэты ж перыяд удасканальвалася агнястрэльная зброя. Яна канчаткова падзялілася на ручную зброю і артылерыю.

#### Змяненне характару ваенных сутыкненняў

Войны Новага часу адрозніваліся ад сярэдневяковых мэтамі, маштабам і больш разбуральнымі наступствамі. Эпоха Вялікіх геаграфічных адкрыццяў абвастрыла супярэчнасці паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў іх барацьбе за калоніі, паклала пачатак войнам за кантроль над марскімі гандлёвымі шляхамі і тэрыторыямі далёка за межамі Еўропы — у Азіяцкім рэгіёне і Амерыцы. З пункту погляду

Якія наступствы для жыхароў метраполій і карэннага насельніцтва калоній неслі гэтыя заваёвы?

калоній гэта былі вызваленчыя войны — войны за свабоду і незалежнасць.

Буйны́мі ваеннымі канфліктамі ранняга Новага часу ў Еўропе былі вайна Нідэрландаў супраць Іспаніі, барацьба паміж Іспаніяй і Англіяй за марское першынство ў XVI ст., Сямігадовая вайна, Вайна за іспанскую спадчыну. Аднак асаблівае месца сярод усіх войнаў ранняга Новага часу займае Трыццацігадовая вайна (1618–1648 гг.), якая зрабілася першай агульнаеўрапейскай вайной.

Барацьба за права на суверэнітэт

**3. Трыццацігадовая вайна і яе ўплыў на міжнародныя адносіны ў Еўропе.** Гэтая агульнаеўрапейская вайна мела дзве асноўныя прычыны: рэлігійныя супярэчнасці паміж каталіцкімі і пратэстанцкімі дзяржавамі і аўстра-французскае спаборніцтва за гегемонію ў Еўропе. Дынастыя Габсбургаў, якая ўмацавалася ва ўладзе Свяшчэннай Рымскай Імперыі, імкнулася аб'яднаць пад сваім уплывам усю Еўропу і стварыць адзіную каталіцкую дзяржаву. Натуральна, гэтаму праціві́ліся пратэстанцкія дзяржавы, а таксама Англія і Францыя. Апошнія адстойвалі ідэю самастойных нацыянальных дзяржаў. Больш за тое, Францыя, нягледзячы на становішча каталіцкай краіны, актыўна выступала супраць Габсбургаў, імкнучыся не дапусціць цэнтралізацыі імперыі, якая складалася з мноства фактычна незалежных германскіх дзяржаў.

Супрацьстаянне каталікоў і пратэстантаў

Вайна пачалася на тэрыторыі Свяшчэннай Рымскай імперыі супрацьстаяннем нямецкіх пратэстанцкіх і каталіцкіх князёў. Каталіцкіх князёў і імператара падтрымлівалі Аўстрыя і Іспанія, пратэстанцкіх князёў — Данія, Швецыя, Англія і Нідэрланды. Ваенныя дзеянні ішлі з пераменным поспехам. У 1635 г., пасля таго як стомленыя баявымі дзеяннямі нямецкія князі-пратэстанты выйшлі з вайны, у канфлікт на баку пратэстантаў уступіла каталіцкая Францыя. Менавіта яна здолела нанесці імпера-

тарскім войскам шэраг паражэнняў, пасля чаго імператар вымушаны быў папрасіць міру.

**Вестфальская сістэма міжнародных адносін**

У 1648 г. бакі канфлікту заключылі Вестфальскі мір. Ад імперыі на карысць Францыі і Швецыі былі адарваныя тэрыторыі, прызнавалася незалежнасць Нідэрландаў ад Іспаніі. Нямецкія князі ператварыліся ў незалежных манархаў, што яшчэ болей аслабляла імператарскую ўладу і замацоўвала раздробленасць Свяшчэннай Рымскай імперыі. Мір ураўнаваў у правах каталікоў і пратэстантаў. Так была пастаўлена кропка ў імкненні Габсбургаў стварыць непадзельную каталіцкую дзяржаву ў Еўропе. Аднак гэты мір займае асаблівае месца ў гісторыі міжнародных адносін. І не таму што ён завяршыў доўгую і крывавую вайну, а таму што аказаў вялікі ўплыў на далейшае гістарычнае развіццё Заходняй Еўропы. Упершыню ў аснову еўрапейскага правапарадку былі закладзены пэўныя прынцыпы.

### ПРЫНЦЫПЫ ВЕСТФАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

- Дзяржаўны суверэнітэт
- Раўнапраўе суверэнных дзяржаў
- Прыярытэт нацыянальных інтарэсаў
- Калектыўная адказнасць краін
- Гарантыі захавання міру

Прынцып раўнапраўя суверэнных дзяржаў азначаў, што цяпер усе кіраўнікі незалежных дзяржаў роўныя паміж сабой, нягледзячы на тытул (імператар, кароль, князь, біскуп і г. д.). Прытрымліванне дзяржаўнага суверэнітэту замацоўвала неўмяшанне адной або некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы іншай. Гэтыя пагадненні атрымалі назву *Вестфальскай сістэмы* міжнародных адносін.

**Розныя рэлігіі**

**4. Сутыкненне цывілізацый Захаду і Усходу.** У пачатку XVI ст. развіццё дзяржаў Усходу, такіх

як Асманская імперыя, Іран і Індыя, ішло сваім самабытным шляхам.

Важным адрозненнем усходніх дзяржаў ад заходніх была рэлігія. У дзяржавах Усходу, дзе дамінавалі такія рэлігіі, як іслам, будызм, індуізм і канфуцыянства, хрысціяне або былі меншасцю, або адсутнічалі ўвогуле.

**Розныя палітычныя сістэмы**

Яшчэ адно відавочнае адрозненне Захаду і Усходу заключалася ў розных палітычных сістэмах. Дзяржавы Усходу ўяўлялі сабой манархіі або імперыі з моцнай цэнтралізацыяй улады і аўтарытарным праўленнем, у той час як заходнія дзяржавы, такія як Англія і Францыя, былі канстытуцыйнымі або абсалютнымі манархіямі, але з больш дэмакратычнай сістэмай кіравання. У канцы XVIII ст. у выніку буржуазнай рэвалюцыі Францыя зрабілася рэспублікай.

**Ваенныя сутыкненні**

Дзяржавы Усходу, такія як Асманская імперыя, Іран або дзяржава Маголаў у Індыі, у пачатку Новага часу з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі сусветнай палітыкі і эканомікі. Перыяд XVI–XVIII стст. адзначаны вострым супрацьстаяннем паміж еўрапейскімі краінамі і Асманскай імперыяй — адной з найбольш магутных дзяржаў свету, межы якой сягалі ад Венгрыі да Егіпта. З цягам часу яе ўлада пачала слабнуць, яна страціла большую частку сваіх тэрыторый і пазбавілася статусу звышдзяржавы. Важнай прычынай такога выніку была яе эканамічная і тэхналагічная адсталасць у параўнанні з заходнімі суседзямі. У XVI ст. дзяржавы Еўропы ўжо дасягнулі высокага ўзроўню развіцця, у той час як Асманская імперыя ўсё яшчэ карысталася традыцыйнымі метадамі вытворчасці і кіравання. Гэта прывяло да таго, што яна не магла эфектыўна спаборнічаць з дзяржавамі Еўропы — Аўстрыяй, Венгрыяй і Польшчай. У 1571 г. Асманская імперыя пацярпела паражэнне ад іспанцаў, венецыянцаў і папскага флоту,

што прывяло да страты ёю свайго панавання на моры. Бітва за Вену 1683 г. зрабілася пераломным момантам у трохстагоддзевым супрацьстаянні мусульманскага свету і Цэнтральнай Еўропы. Перамога хрысціян пад камандаваннем караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна Сабескага спыніла заваявальныя паходы мусульман на еўрапейскія землі. Аўстрыя на дзесяцігоддзі ператварылася ў наймагутнейшую дзяржаву Цэнтральнай Еўропы, адваяваўшы ў туркаў Паўднёвую Венгрыю і Трансільванію.

Знайдзіце на картасхеме на с. 118 тэрытарыяльныя межы Асманскай імперыі.

**Новыя пагрозы**

Сур'ёзную пагрозу для туркаў уяўляў Іран, а з канца XVII ст. галоўным праціўнікам зрабілася Расійская імперыя, якая актыўна пашырала свае тэрыторыі ў бок Крыма і Чорнага мора. Канфлікты паміж дзвюма магутнымі дзяржавамі прываялі да серыі войнаў, што працягваліся да пачатку XIX ст.

Найбольшую пагрозу для Усходу ў XVI–XVIII стст. уяўляла еўрапейская каланіяльная экспансія, якая пачалася адначасова з Вялікімі геаграфічнымі адкрыццямі і ахапіла ўвесь свет у наступныя стагоддзі. Каланіяльныя памкненні еўрапейскіх дзяржаў непазбежна вялі да сутыкненняў паміж заходнімі і ўсходнімі цывілізацыямі, што істотна паўплывала на сусветную гісторыю.

**5. Варыянты адказу на выклік Захаду.** З нарастаннем навуковай і ваенна-тэхнічнай магутнасці Еўропы валадары ўсходніх дзяржаў усвядомілі неабходнасць змен. Рэакцыя Усходу на выклік заходняй цывілізацыі залежала ад унутрыпалітычнай стабільнасці, эканамічнага дабрабыту і ваенна-тэхнічных магчымасцей усходніх дзяржаў.

Як ужо было адзначана раней, Асманская імперыя напрыканцы XVII ст. пачала слабнуць. Гэта было звязана з унутранымі праблемамі, сацыяльнымі пратэстамі і слабейшай эканомікай у параўнанні з заходнімі дзяржавамі. Ва ўмовах відавочнага адставання кіраўнікі Асманскай імперыі зрабілі шэраг



*Асманскія янычары*

Успомніце, хто такія янычары.

выключных захадаў, у тым ліку ажыццявілі мадэрнізацыю сваёй арміі на еўрапейскі ўзор і рэформу ваенна-леннай сістэмы. Аднак рэформы насілі абмежаваны характар, да таго ж не былі падтрыманыя мусульманскім духавенствам і янычарамі. Гэтая акалічнасць прывяла да адхілення ад улады султана Селіма III.

**Іран**

Яшчэ адной дзяржавай, якая сутыкнулася з выклікам заходняй цывілізацыі ў XVI–XVIII стст., быў Іран. Унутраныя праблемы і канфлікты з еўрапейскімі дзяржавамі і Асманскай імперыяй прывялі да нестабільнасці ў рэгіёне. Пры шаху Абасе I і яго пераемніках у Іране былі праведзены мадэрнізацыя арміі, рэформа дзяржаўнага кіравання, умацаваны межы. Аднак Іран адрозніваўся нестабільнасцю развіцця, гэтыя рэформы перыядычна згортваліся.

**Індыя**

Чаму захоп Індыі быў запаветным жаданнем адразу дзвюх буйны́х еўрапейскіх дзяржаў?

Для Індыі ўзаемадзеянне з еўрапейцамі ў перыяд XVI–XVIII стст. аказалася трагічным. У сярэдзіне XVIII ст. пачалася брытанская заваёва гэтай краіны. Індыя зрабілася аб’ектам канкурэнтнай барацьбы паміж Англіяй і Францыяй, з якой пераможцамі выйшлі брытанцы.

**Японія**

Еўрапейцы, у асноўным партугальцы, у XVI ст. пачалі актыўна гандляваць з Японіяй і будаваць свае паселішчы на астравах. Аднак гэты кантакт быў ускладнены многімі культурнымі і рэлігійнымі адрозненнямі паміж Японіяй і Еўропай. Убачыўшы ў еўрапейцах пагрозу, японскія валадары з дынастыі Такугава вырашылі ўвесці палітыку *самаізаляцыі* Японіі — сакоку (літаральна — «краіна на ланцугу») (1641–1853 гг.).

Палітыка сакоку значыла «закрыццё» Японіі для іншаземцаў і ў цэлым абмежаванне кантактаў са знешнім светам. Толькі невялікай колькасці галандцаў і кітайцаў было дазволена наведваць краіну для гандлю, пры гэтым яны былі абмежаваныя ў сваіх перамяшчэннях. Палітыка сакоку захоўвала-

ся да сярэдзіны XIX ст., калі Японія была вымушана адкрыць уезд у краіну пад ціскам заходніх дзяржаў.

**Кітай**

«Паднябесная імперыя», як самі называлі сваю дзяржаву жыхары Кітая, таксама ўвайшла ў сферу заходняй экспансіі ў XVI–XVIII стст. Еўрапейскія каланізатары і купцы пачалі актыўна гандляваць з Кітаем, асабліва ў партах на паўднёвым узбярэжжы. У адказ кітайскі імператар абмежаваў кантакты Кітая з Еўропай і ўвёў палітыку самаізаляцыі, якая атрымала назву хайцзінь (літаральна — «марская забарона»).

Палітыка хайцзінь азначала «закрыццё» Кітая для іншаземцаў, за выключэннем невялікай колькасці еўрапейцаў. Кітай заставаўся адкрыты для гандлю, але толькі ў пэўных партах, дзе былі ўсталяваны гандлёвыя пасты. Быў таксама абмежаваны гандаль опіумам, што прывяло ў сярэдзіне XIX ст. да канфлікту з Вялікабрытаніяй.

І Японія, і Кітай зрабілі захады па самаізаляцыі, каб прадухіліць уплыў заходняй цывілізацыі на сваю культуру і эканоміку. Аднак гэтыя меры непазбежна вялі да адставання ад заходніх дзяржаў у тэхнічным, эканамічным і навуковым развіцці.

**6. Рэвалюцыйныя хваляванні ў першы перыяд Новага часу.** У XVI–XVIII стст. у Еўропе адбылося шмат рэвалюцыйных падзей, якія змянілі палітычную сістэму, эканоміку, сацыяльную структуру і межы дзяржаў. Гэта быў час вялікіх змен, калі асобныя краіны Еўропы імкнуліся да магутнасці і сусветнага панавання, а еўрапейскае грамадства змагалася за свае правы і свабоды. Буржуазныя рэвалюцыі спрыялі пераходу ад Сярэднявечча да Новага часу.

**Прычыны еўрапейскіх рэвалюцый**

Адной з асноўных прычын рэвалюцый у розных краінах Еўропы было пагаршэнне эканамічнай сітуацыі, звязанае з крызісам феадальнай эканомікі. Распад феадалізму суправаджаўся інтэнсіўным

развіццём капіталістычных адносін. Пачынаючы з XVI ст. Еўропа сутыкнулася з серыяй эканамічных крызісаў, інфляцыяй і ростам падаткаў. Усё гэта прывяло да ўзмацнення няроўнасці, беднасці і незадаволенасці насельніцтва сваім становішчам.

Іншай важнай прычынай рэвалюцый былі сацыяльныя супярэчнасці. У той час у Еўропе існавалі розныя сацыяльныя групы, такія як знаць, духавенства, купцы, сяляне і рабочыя. Кожная з іх мела свае інтарэсы і патрабаванні. Напрыклад, рабочыя патрабавалі паляпшэння ўмоў працы і вышэйшых заробкаў, у той час як сяляне — абароны ад землеўладальнікаў. Амаль непрымірымыя супярэчнасці існавалі паміж дваранствам і буржуазіяй, якая зараджалася, паміж заможнымі класамі і працоўнымі горада і вёскі.

Варта адзначыць і тую акалічнасць, што ў розных частках Еўропы ішлі войны, адбываліся рэлігійныя канфлікты, перавароты і змены дынастый. Усё гэта вяло да нестабільнасці ў грамадстве і няўпэўненасці ў будучыні.

### Буржуазныя рэвалюцыі ў Еўропе

**Буржуазная рэвалюцыя** — рэвалюцыя, накіраваная на знішчэнне феадальнага ладу, усталяванне капіталістычных адносін і пераход улады ў рукі буржуазіі.

Найважнейшую ролю ў гісторыі Новага часу адыгралі **буржуазныя рэвалюцыі**, першай з якіх была *Нідэрландская рэвалюцыя* (1566–1609 гг.). Ад самага пачатку яна прыняла форму нацыянальна-вызваленчай барацьбы супраць іспанскага панавання. Мясцовае насельніцтва доўгія гады пакутавала ад непамерных падаткаў, пры гэтым толькі дзякуючы сваёй уласнай працы дасягнула найвышэйшага ўзроўню вытворчасці і гандлю. Важны быў і рэлігійны фактар: нідэрландцы былі пратэстантамі і аспрэчвалі ўсталяванне панавання каталіцкай рэлігіі. У выніку паспяховай рэвалюцыі на карце свету з'явілася незалежная дзяржава Нідэрланды, якая ў далейшым ператварылася ў адну з найбольш развітых краін Еўропы.

Адной з самых значных сацыяльных рэвалюцый была *Англійская рэвалюцыя* (1640–1660 гг.). Яна

была выклікана канфліктам паміж каралём і парламентам наконт межаў улады. У выніку манархію зрынулі і стварылі рэспубліку, якая ў далейшым была заменена на канстытуцыйную манархію. Такім чынам, рэвалюцыя прывяла да ўзнікнення новай формы праўлення, заснаванай на прыярытэце законнасці і прыватнай уласнасці як свяшчэннай і недатыкальнай.

Асаблівай увагі заслугоўвае *Французская рэвалюцыя* (1789–1799 гг.), якая прывяла да звяржэння манархіі і ўсталявання рэспублікі. Рэвалюцыя зрабілася сімвалам барацьбы за свабоду і роўнасць, выклікала велізарныя палітычныя і сацыяльныя змены ў Еўропе.

Папулярныя яшчэ да рэвалюцыі карыкатуры паказвалі двараніна і святара — прадстаўнікоў першага і другога саслоўяў — як нахлебнікаў, што ўмасціліся на шыі зморанага «трэцяга саслоўя». На адной з іх селянін ад непасільнай працы нават не мае сіл адагнаць птушак і трусоў, што пажыраюць яго ўраджай.



*Французскія карыкатуры XVIII ст.*

## Вайна за незалежнасць ЗША

Канец XVIII ст. адзначыўся пераменамі ў Амерыцы. Калоніі, якія стагоддзямі знаходзіліся пад кантролем еўрапейскіх манархій, пачалі выказваць імкненне да незалежнасці. На той час многія з іх выраслі ў моцныя эканамічныя і палітычныя цэнтры. Але пры гэтым яны мелі праблему: падаткаабкладанне не рэгулявалася, а гандляваць можна

было толькі з мацерыковай Еўропай, што выклікала незадаволенасць калоній. У 1775–1783 гг. 13 англійскіх калоній, што займалі ўсходнюю частку Паўночнай Амерыкі, вялі знясільваючую *вайну за незалежнасць*. Пачатковыя патрабаванні права на прадстаўніцтва ў брытанскім парламенце паступова перараслі ў жаданне амерыканцаў цалкам вызваліцца ад улады метраполіі і стварыць уласную суверэнную дзяржаву. Яны заручыліся падтрымкай з боку Францыі і Іспаніі, зацікаўленых у аслабленні магутнай Вялікабрытаніі. Парыжская мірная дамова, якой завяршылася супрацьстаянне, пацвярджала прызнанне незалежнасці ЗША з боку Вялікабрытаніі і адзначыла сабой стварэнне новай нацыі. Гэта быў першы ў гісторыі факт здабыцця незалежнасці ад еўрапейскай каланіяльнай дзяржавы. Парыжская дамова зрабілася важнаю вехай у сусветнай гісторыі і змяніла баланс сіл у міжнароднай палітыцы.

Палітычныя змены

**7. Наступствы рэвалюцый, іх гістарычнае значэнне.** Буржуазныя рэвалюцыі аказалі вялікі ўсебаковы ўплыў на еўрапейскае грамадства. Адным з найважнейшых іх наступстваў была адмова манархаў ад абсалютнай улады і пераход да больш дэмакратычных формаў праўлення, такіх як рэспубліка і канстытуцыйная манархія. Канстытуцыі заклалі аснову новай, буржуазнай дзяржавы, што палітычна адлюстроўвала пераход ад феадальнага грамадства да капіталістычнага.

Перанос рэвалюцыйных пераўтварэнняў у суседнія краіны

Еўрапейскія рэвалюцыі аказалі значнае ўздзеянне на сацыяльную структуру грамадства, былі адпраўным пунктам маштабных пераўтварэнняў. Яны спрыялі ўмацаванню пазіцый сярэдняга пласта грамадства, які зрабіўся важным удзельнікам палітычнага і эканамічнага жыцця, і адначасова аслабілі ўплыў арыстакратыі, якая доўгі час дамінавала ў грамадстве. Рэвалюцыі спарадзілі новыя палітычныя сілы і рухі, якія занялі ключавое месца ў гісто-

рыі Еўропы, змянілі ўяўленні пра ўладу, свабоду і правы грамадзян. Ідэі, што нарадзіліся ў ходзе рэвалюцыйных пераўтварэнняў, імкліва пашыраліся за межы Еўропы, натхняючы рэформы і грамадскія пераўтварэнні ў іншых краінах.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Артыкулы з Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна (1789 г.)**

Арт. 1. Людзі нараджаюцца і застаюцца свабоднымі і роўнымі ў правах.

Арт. 2. Мэта ўсякага палітычнага саюзу — забеспячэнне натуральных і неад'емных правоў чалавека. Гэтыя правы — свабода, уласнасць, бяспека і супраціўленне прыгнёту.

Арт. 3. Крыніцай суверэннай улады з'яўляецца нацыя. Ніякія ўстановы, ніводзін індывід не могуць мець уладу, якая не зыходзіць яўна ад нацыі.

Арт. 4. Свабода ўяўляе сабой магчымасць рабіць усё, што не шкодзіць іншаму: такім чынам, ажыццяўленне натуральных правоў кожнага чалавека абмежавана толькі тымі межамі, якія забяспечваюць іншым членам грамадства карыстанне тымі ж правамі. Межы гэтыя могуць быць вызначаны толькі законам.

Арт. 5. Закон мае права забараняць толькі дзеянні, шкодныя для грамадства. Усё, што не забаронена законам, тое дазволена, і ніхто не можа быць прымушаны рабіць тое, што не прадпісана законам.

Арт. 6. Закон ёсць выражэнне агульнай волі. Усе грамадзяне маюць права ўдзельнічаць асабіста або праз сваіх прадстаўнікоў у яго стварэнні. Ён павінен быць адзіным для ўсіх, ахоўвае ён ці карае. Усе грамадзяне роўныя перад ім і таму маюць роўны доступ да ўсіх пастоў, публічных пасад і заняткаў адпаведна іх здольнасцям і без якіх бы там ні было іншых адрозненняў, апроч тых, што абумоўлены іх вартасцямі і здольнасцямі.

*1. Якія правы чалавека абвяшчала французская Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна?*
*2 Што значыць «натуральныя і неад'емныя правы»?*
*3. Што ёсць свабода паводле дадзенага дакумента? Ці згодныя вы з такім вызначэннем? Свой адказ абгрунтуйце.*
*4. Якія ідэі Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна адлюстраваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?*
*5. Зрабіце вывад наконт ролі гэтага дакумента ў сусветнай гісторыі.*

*Палітычнае развіццё ў XVI–XVIII стст. характарызавалася ўсталяваннем абсалютызму ў заходнееўрапейскіх краінах і Расіі, шматлікімі войнамі. У гэты перыяд абвастрыліся ўзаемаадносіны цывілізацый Захаду і Усходу, шмат у чым гэта было абумоўлена пачаткам каланіяльнай экспансіі еўрапейскіх дзяржаў. Адны ўсходнія дзяржавы ў пошуках адказаў на выклікі Захаду праводзілі рэформы, другія — палітыку самаізаляцыі. Рэвалюцыі XVI–XVIII стст. былі вынікам складаных сацыяльна-эканамічных і палітычных змен, якія адбыліся ў грамадстве. Яны адзначылі пераход ад феадальнага да капіталістычнага грамадства.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| XVI–XVIII стст. — усталяванне ў заходнееўрапейскіх краінах і Расіі абсалютызму | XVI–XVIII стст. — захаванне саслоўна-прадстаўнічай манархіі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія былі прычыны пераходу да абсалютнай манархіі ў еўрапейскіх дзяржавах у XVI–XVIII стст.?
2. Ахарактарызуйце асаблівасці войнаў ранняга Новага часу. Чым, на вашу думку, яны былі абумоўлены?
3. Складзіце схему, якая тлумачыць прычыны, вынікі і гістарычную ролю Трыццацігадовай вайны.
4. У чым заключалася прычына супрацьстаяння ўсходніх і заходніх дзяржаў у ранні Новы час? Прывядзіце прыклады розных варыянтаў адказу азіяцкіх дзяржаў на экспансіяніцкія выклікі Захаду. Якія перавагі і недахопы меў кожны з іх?
5. Складзіце табліцу «Прычыны і вынікі рэвалюцый XVI–XVIII стст.». Ацаніце іх гістарычнае значэнне.